УДК 325.2-054.6(476)(091)”18/19”

# ЗАМЕЖНІКІ-ПЕРАСЯЛЕНЦЫ Ў БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯХ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

***А.С. Потрасава***

*Беларускі дзяржаўны універсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, elena.potrosova@yandex.ru*

У артыкуле разглядаецца прававое становішча замежных перасяленцаў на падставе дзейнасці Статута аб калоніях 1857 г. і законапалажэнняў 1861, 1871, 1887 гг. Статут стаў першым комплексным прававым дакументам у заканадаўстве Расійскай імперыі, у якім агаворваліся прывілеі, свабоды і абавязкі каланістаў, дакумент рэгуляваў працэс перасялення, размяшчэння і забеспячэння перасяленцаў. Пасля адмены прыгоннага права ў 1861 г. памешчыкі Беларусі пачалі запрашаць замежных рабочых пасяліцца ў іх маёнтках, такім чынам пачалі ўзнікаць калоніі на прыватных землях, па дагаворах з іх уладальнікамі. Асаблівасцю ў Беларусі было тое, што не існавала калоній замежнікаў на казённых землях, а пасля 1887 г. замежнікі-перасяленцы страцілі права набываць ва ўласнасць прыватныя землі.

***Ключавыя словы***: *замежнікі-перасяленцы; Статут аб калоніях 1857 г.; каланісты; падданства; замежныя падданыя; калоніі на прыватных землях.*

# ИНОСТРАНЦЫ-ПЕРЕСЕЛЕНЦЫ В БЕЛОРУССКИХ ГУБЕРНИЯХ ВО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ XIX – НАЧАЛЕ XX в.

***Е.С. Потросова***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, elena.potrosova@yandex.ru*

В статье рассматривается правовое положение иностранных переселенцев на основании деятельности Устава о колониях 1857 г. и законоположений 1861, 1871, 1887 гг. Устав стал первым комплексным правовым документом в законодательстве Российской империи, в котором оговаривались привилегии, свободы и обязанности колонистов, документ регулировал процесс переселения, размещения и обеспечения переселенцев. После отмены крепостного права в 1861 г. помещики Беларуси начали приглашать иностранных рабочих поселиться в их имениях, следовательно начали возникать колонии на частных землях, по договорам с их владельцами. Особенностью в Беларуси было то, что не существовало колоний иностранцев на казенных землях, а после 1887 г. иностранцы-переселенцы утратили право приобретать в собственность частные земли.

***Ключевые слова:*** *иностранцы-переселенцы; Устав о колониях 1857 г.; колонисты; подданство; иностранные подданные; колонии на частных землях.*

# RESIDENT-FOREIGNERS IN BELARUSIAN PROVINCES IN THE HALF OF THE XIX – THE BEGINNING OF THE XX CENTURY

***E.S. Potrosova***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus, elena.potrosova@yandex.ru*

The article discusses the legal status of foreign immigrants on the basis of the activities of the Charter on the colonies of 1857 and the laws of 1861, 1871, 1887. The charter became the first comprehensive legal document in the legislation of the Russian Empire, which stipulated the privileges, freedoms and duties of the colonists, the document regulated the process of resettlement, accommodation and provision of immigrants. After the abolition of serfdom in 1861, the landowners of Belarus began to invite foreign workers to settle on their estates, therefore colonies began to appear on private lands, under agreements with their owners. The peculiarity in Belarus was that there were no colonies of foreigners on state lands, and after 1887, foreign migrants lost the right to acquire private lands.

***Key words:*** *foreign migrants; Charter of the colonies of 1857; colonists; citizenship; foreign nationals; colonies on private lands.*

У другой палове XIX ст. у беларускіх гарадах і мястэчках пражывалі паданныя замежных краін, якія актыўна пачалі перасяляцца ў губерні Расійскай імперыі ў часы праўлення Кацярыны II і выдання Маніфеста 1762 г. Іншаземцаў запрашалі з мэтай засялення далучаных тэрыторый аселым насельніцтвам. У перыяд з 1789 па 1820-я

гады у сувязі з абвастрэннем міжнароднага становішча і напалеонаўскімі войнамі прыпыняецца працэс прыцягнення замежнікаў у імперыю. Урад асцярожна ставіўся да замежных падданых, асабліва да французаў. Аднак, загад 1860 г. змяняе становішча замежнікаў, зноў з'яўляецца неабходнасць людскіх рэсурсаў да засялення пустуючых зямель і заснаваных калоній. Сярод прычын і мэтаў перасялення замежнікаў у імперыю можна адзначыць не толькі прывілеі і льготы, якія абяцала імперскае заканадаўства, але нярэдка цяжкае эканамічнае і сацыяльна-прававое становішча на радзіме, абеззямельванне. Асноўную масу насельніцтва, якая прыязджала на беларускія землі, складалі немцы,чэхі. Напрыклад, у артыкуле Н.М. Філюты, галоўнай прычынай, якая вымусіла чэшскае насельніцтва перасяліцца ў Расійскую імперыю з’явілася пагаршэнне ўмоў жыцця ў самой Чэхіі, дзе бурны прамысловы ўздым у канцы 60 – пачатку 70-х змяніўся ў 1873 г. эканамічным крызісам, ахапіўшым усю Еўропу. Збядненне працоўных мас, сацыяльныя супярэчнасці выклікалі рост эміграцыі чэхаў у ЗША, Бразілію і Расію. Невялікая колькасць выхадцаў з Францыі тлумачыцца не толькі негатыўнымі адносінамі да французаў пасля 1812 г., але і тым фактам, што ў 1762 г. выдаюцца законы, якія ўводзілі пакаранне за эміграцыю і забаранялі таксама агітацыю за перасяленне ў іншыя краіны [9, с. 219].

Вялікую цікавасць да вывучэння праблем міграцыі на сённяшні дзень уяўляюць пытанні, якія датычацца прысутнасці замежных падданых у сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці беларускіх губерняў у другой палове XIX – пачатку XX ст. Актуальнасць працы абумоўлена тым, што на сучасны момант не існуе поўнага даследвання, якое б ахапіла ўсю гісторыю знаходжання замежнікаў - перасяленцаў, аналіз іх прававога, сацыянальна-эканамічнага, культурнага жыцця і дзейнасці на беларускіх землях у адзначаны перыяд у айчыннай навуцы. Гістарыяграфія праблемы дазваляе падкрэсліць увагу беларускіх даследчыкаў толькі да вывучэння прысутнасці чэхаў і немцаў на Гомельшчыне, а таксама ў Мінскай губерні ў першай палове XIX ст. і 20-30-ыя гг. XX ст., наяўнасць нацыянальных меншасцяў у пасляваенны савецкі і сучасны перыяды. Некаторыя аспекты вывучэння замежнікаў-каланістаў былі закрануты ў артыкулах Н.М. Філюты, В.П. Пічукова, В.В. Урублеўскага, С.М. Рындзіна. Асаблівую каштоўнасць уяўляе зборнік дакументаў, састаўленны І.Л. Вернер і быў выдадзены ў 2012 г. Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі «Замежныя падданыя ў Беларусі». У гэтай працы змяшчаюцца архіўныя дакументы, рэгламентаваўшыя жыцце і дзейнасць замежнікаў на тэрыторыі беларускіх губерняў з канца XVIII – да пачатку XX ст.[1] Замежныя даследчыкі ўвогуле не разглядалі гэтае пытанне. У расійскій гістарыяграфіі назіраецца павышаная ўвага да высвятлення пытанняў прававога статусу замежнікаў – каланістаў Наваросіі, Крыма, Паўночнага Каўказа і Паволжа. Маецца шэраг прац, у якіх разглядаюцца асаблівасці ўезду, знаходжання, а ў большай ступені прававого становішча і дзейнасці замежнікаў-каланістаў як у агульнаімперскім, так і рэгіянальным маштабе ў XVIII–XX стст.

У сувязі з вялікай колькасцю перасяленцаў у імперыю ў другой палове XIX ст. з’явілася неабходнасць рэфармавання заканадаўства, якое датычалася замежных падданых. Да гэтага часу не было вызначана прававое становішча замежнікаў, якія адносіліся да катэгорыі каланістаў і сялян-перасяленцаў. Таму важным крокам стала распрацаванне Статута аб калоніях замежнікаў у Імперыі, які абагульніў законапалажэнні ў адносінах да замежных каланістаў, прынятыя ў Расійскай імперыі ў апошняй трэці XVIII і 1-й палове XIX стст. Да гэтага часу пытанні перасяленцаў вырашаліся на падставе дзеючых заканадаўчых актаў, такіх як Статут аб пашпартах 1857 г., Статут аб саслоўях 1857 г., Мытны статут. Статут быў зацверджаны ў 1857 г. і складаецца з 9 раздзелаў і 577 параграфаў. Згодна статуту калоніі падзяляліся на тры групы: 1) калоніі на землях казённых; 2) калоніі на набытых замежнымі перасяленцамі ва ўласнасць землях; і 3) калоніі на прыватных земля па дагаворах з іх уладальнікамі. Да ліку калоній на казённых землях адносіліся калоніі Саратаўскія, паўднёвыя калоніі ў Наварасійскіх губернях, паўночныя – ў Санкт-Петербургскай губерні і інш. На землях беларускіх губерняў не былі ўтвораны калоніі за казённы кошт [3, с. 9]. 18 снежня 1861 г. былі зацверджаны меркаваннем Дзяржаўнага савета правілы для найму землеўладальнікамі замежных працоўных і пасялення замежнікаў у Расіі. Палажэнні, якія датычаліся беларускіх губерняў пачынаются з артыкула 510 Статута аб калоніях ад 1857 г., так дазваляецца прымаць на змяшчэнне ўсім наогул асобам, якія маюць права набываць і валодаць землямі, без адрознення званняў. Закон надаваў права на пасяленне на ўласніцкіх землях замежных падданых, якія добраахвотна пажадаюць пасяліцца ў імперыі і прыняць рускае падданства. Землеўладальнікам давалася права

ўступаць у папярэднія дамовы з замежнікамі, якія павінны былі мець пасведчанне Расійска-Імператарскай місіі ў тым, што на ўезд і пасяленне іх у імперыі перашкод не існуе. Змяшчэнне каланістаў на землях прыватных уладальнікаў здзяйсняецца па ўзаемных дагаворах. Каланісцкія раёны падпарадкоўваліся асаблівым аддзелам Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў. Вышэйшай інстанцыяй для ўсіх калоній было Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў [2, с. 20].

Разглядаючы дадзеную тему даследавання нас больш цікавяць калоніі на прыватных землях, па дагаворах з іх уладальнікамі. Землеўладальнікі ўсіх губерняў імперыі маглі наймаць замежных працоўных на падставе дзеючых агульных пастаноў, замежнікам выдаваўся пашпарт на ўвесь тэрмін найму, але не больш чым на 12 гадоў. У сваю чаргу ва ўмовах дэфіцыту мясцовай рабочай сілы, а таксама пасля адмены прыгоннага права ў Расійскай імперыі ў 1861 г., самі памешчыкі Віленскай, Мінскай, Гродзенскай і Магілеўскай губерній, альбо праз сваіх агентаў, прыязджалі ў Германію і іншыя краіны, запрашалі рабочых пасяліцца ў іх маёнтках ў якасці каланістаў з мэтай выкарыстання іх працы ў асноўным на сельскагаспадарчых працах [9, с.219]. Памешчыкі абяцалі спрыяльныя ўмовы для жыцця і дзейнасці ў сваіх уладаннях. Але, як адзначаецца ў прашэннях 136 сямействаў нямецкіх перасяленцаў, умовы не апраўдалі чаканні, прыехаўшы ў маёнткі, яны не сустрэлі дапамогі з боку памешчыкаў і іх кіраўнікоў, адчувалі толькі прытясненні і пастаянныя крыўды, былі даведзены да галечы і патрабавалі перасяліць іх у Рэчыцкі павет з мэтай надзялення свабоднай зямлёй [1, с. 137–138]. У архіўных пастановах Мінскага губернскага праўлення ад 1865 г. таксама змяшчаюцца дадзеныя пра 17 аўстрыйскіх сямейств з уладанняў Ліпава Рэчыцкага павета памешчыка Горвата, якія пажадалі прыняць рускае падданства і прасілі пасяліць іх на казённых землях. Па сакрэтнаму даручэнню начальніка губерні было праведзена даследванне становішча пересяленцаў і выяўлена, што зямлю яны атрымалі недобраякасную, пасля прыняцця імі праваслаўя ўпраўляючы Рымашэўскі стаў даваць менш заробкаў, паменшылася выдача хлеба, які быў даражэйшы і горшы па якасці, для апрацоўкі палёў не атрымлівалі скаціну, таму пакідалі сваі землі без пасеваў. Большая частка чэхаў, даведзенная да галечы адмовілася ад прыняцца падданства і вярнулася на радзіму [1, с. 140–143]. Нярэдка паміж замежнымі каланістамі і мясцовымі сялянамі ўзнікала атмасфера недаверу, гэтаму шмат у чым спрыялі законапалажэнні аб калоніях, якія ізалявалі замежнікаў і перашкаджалі ім зліцца з мясцовым насельніцтвам.

Наступная катэгорыя паселешчаў каланістаў – гэта калоніі на набытых замежнымі перасяленцамі ва ўласнасць землях. Да 1887 г. замежнікі, якія прыязджалі ў беларускія губерні мелі права набываць у прыватных людзей ва ўласнасць землі і сяліцца на іх. Тым, хто пасяліўся на набытых землях, даравалася агульная, для ўсіх каланістаў устаноўленая, дзесяцігадовая льгота ад плацяжу падаткаў і выпраўлення павіннасцяў, па заканчэнні якой, яны абкладаліся падаткам нароўні з памешчыцкімі сялянамі. Іншыя павіннасці ва -ўсіх адносінах яны павінны былі несці нароўні з іншымі прыроднымі жыхарамі таго краю, дзе паселяліліся. Згодна з арт. 508 Статута ад 1857 г. у выпадку, калі б хто-небудзь з такіх пасяленцаў, якія валодаюць землямі ва ўласнасці, пажадаюць выехаць зусім з дзяржавы, то павінны, пры выездзе сваім, прадаць набытую ім зямлю, інакш пастуціць яна ў казну безграшовых. Права гэтае распасціралася не толькі на першых набытчыкаў зямель, але і на спадчыннікаў іх, у выпадку калі пажадаюць яны выехаць з імперыі [8]. Аднак, 14 сакавіка 1887 г. былі зацвержаны часовыя асабовыя правілы ў Віленскай, Мінскай, Віцебскай губернях, згодна якім замежнікі не мелі правоў на валоданне нерухомай маемасцю вне гарадскіх паселішчаў [6, с. 36].

Другі раздзел Статута трактаваў грамадзянскі стан каланістаў, усталёўваў, што каланістамі лічацца толькі тыя замежнікі, якія пасяляліся на каронных, прыватных ці уласна набытых землях у якасці сялян або патрэбных у земляробстве рамеснікаў. Каланістам надавалася свабода веравызнання, яны маглі будаваць цэрквы і наймаць святароў. Так, для нямецкіх каланістаў, якія пражывалі ў Гомельскім маёнтку князя Паскевіча Эрыванскага, былі закуплены прадметы рэлігійнага культу. У абавязкі настаўніка калоніі Кірхнера ўваходзіла здзяйсняць пропаведзі ў нядзелю [1, с. 419–421].

У трэцім раздзеле Статута рэгуляваліся пытанні шлюбу і разводу, а таксама прызначэння апекуноў для сірот. Што датычыцца асабістай свабоды пасяленцаў, то арт. 524 тлумачыць, што яны назаўсёды захоўваюць асабістую сваю свабоду і ўладальнікі зямель ні пад якім выглядам не могуць умацоўваць іх да сабе ва ўласнасць. Арт. 522 каланісты, выканаўшы ўсе абавязкі, замацаваныя з уладальнікам, могуць пераходзіць ад яго да другога. Арт. 523 каланісты, якія пасяляюцца на землях прыватных уладальнікаў, вызваляюцца на ўвесь час знаходжання іх у Расіі ад вайсковай і

грамадзянскай службы. Аднак, 4 чэрвеня 1871 г. былі зацверджаны новыя законапалажэнні, якія поўнасцю змянялі дзеянне Статута аб калоніях 1857 г. Згодна ім перасяленцы страчвалі шмат льгот і прыраўноўваліся да стану памешчыцкіх сялян. Мужчыны павінны былі адбываць вайсковую павіннасць [3, с. 18].

Па дадзеным Н.М. Філюты, большасць чэшскіх і славацкіх каланістаў прыбыла ў Беларусь на працягу 1862 г. згодна з умовамі кантрактаў з беларускімі памешчыкамі, якія былі падпісаныя на шэсць, сем ці восем гадоў. Умовы кантрактаў прымаючага бока выконваліся не цалкам, таму частка пасяленцаў вярнулася на Радзіму, але ў той жа час большасць каланістаў пажадала застацца на землях памешчыкаў. Пераважна чэхі-каланісты абралі для жыхарства Мінскую губерню (Рэчыцкі і Мазырскі паветы). Усяго ў маёнткі Мінскай губерні прыбыло 818 чэхаў-каланістаў. Найбуйнейшыя чэшскія паселішчы ў Беларусі ў канцы XIX ст. размяшчаліся на тэрыторыі маёнткаў Галоўчыцы і Барбароў Рэчыцкага павета Мінскай губерні, якія належалі памешчыкам Горватам [9, с. 219]. Нямецкая калонія знаходзілася ва ўладаннях князя Фёдара Паскевіча-Эрыванскага ў Гомельскім маёнтку. Першапачаткова быў складзены спіс расходаў па вярбоўцы і дастаўцы замежных перасяленцаў ў маёнтак. Ён уключаў у сябе перавозку каланістаў, выдаткі на прадукты харчавання, мытныя выплаты, афармленне пашпартоў [4, л. 1].

З пачатку Першай сусветнай вайны ў выніку ўрадавай палітыкі па ачыстцы прыфрантавой паласы ад падданых варожых Расійскай імперыі дзяржаў, аўстра-венгерскія падданыя чэхі і славакі, а таксама немцы былі высланы ва ўнутраныя губерні імперыі. Для свайго часовага змяшчэння дэпартаваныя абралі Арлоўскую, Варонежскую, а таксама Саратаўскую і Кастрамскую губерні, дзе да гэтага часу размяшчаліся шматлікія калоніі замежнікаў. Малалетнім дзецям, асобам сталага ўзросту, абцяжараным хваробамі, а таксама тым, якія прынялі падданства Расійскай імперыі да пачатку вайны, было дазволена застацца на ранейшым месцы жыхарства [7].

Нягледзячы на тое, што чэшская і нямецкая міграцыя на тэрыторыю сучаснай Беларусі працягвалася на працягу другой паловы XIX – пачатку XX ст, важна адзначыць, што яна не была такой масавай, як у цэнтральнай і паўднёвай частцы імперыі. Абсалютная большасць пасяленцаў у Беларусі былі сельскагаспадарчыя працоўныя, якія прыязджалі ў асноўным з прычыны абязямельвання на радзіме. Паселічшы былі невялікімі і неаднаразова перасяленцы не адбывалі ўвесь тэрмін, на які быў заключаны кантракт з памешчыкам. Нярэдкімі былі выпадкі, калі пасля заканчэння тэрміну дагавора, працоўныя заставаліся і прыймалі рускае падданства. З другой паловы XIX ст. змяняецца заканадаўства ў адносінах да замежнікаў, яны страчваюць шмат льгот, якія раней былі адной з прычын перасялення ў беларускія губерні, на гэта ўплывала знешняя палітыка, сацыяльнае і эканамічнае развіццё губерняў.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Вернер И.Л. Иностранные подданные в Беларуси (конец XVIII – начало XX в. ) / сост. И.Л. Вернер; редкол.: В.И. Адамушко [и др.]. Минск: Тип.Макарова и К, 2012.
2. Каненберг-Сандул О.К. Устав о колониях иностранцев в Российской империи 1857 года: историко-правовой анализ. // Научный вестник Международного гуманитарного университета. Сер.: Юриспруденция. 2014. № 9-2. т.1
3. Мыш М.И. Об иностранцах в России. Сборник узаконений, трактатов и конвенций, с относящимися к ним правительственными и судебными разъяснениями. СПб., 1888.
4. НГАБ. Ф. 3013. Воп. 1. Спр. 455. Арт. 1.
5. Немцы ў валоданнях Радзівілаў. Электронны рэсурс: http://www.radziwill.by/index.php?option=com_content&view=article&id=43:2010-05-26-10-16-22&catid=13:4----&Itemid=2. Дата доступу: 21.12.2014.
6. Потрасава А.С. Саслоўна-прававое становішча замежных падданых у беларускіх губернях у другой палове XIX–пачатку XX стагоддзя // Вестник Полоцкого государственного университета. 2014. № 9. С. 33–37.
7. Рындин С.Н. Этнические немцы на территории Беларуси в конце XIX – начале XXI века. Международная заочная научно-практическая конференция «Актуальные вопросы философии, истории и политологии» (Россия, г. Новосибирск, 28 января 2013 г.). Электронны рэсурс: http://sibac.info/index.php/2009-07-01-10-21-16/6236. Дата доступу: 28.10.2019.
8. Свод законов Российской Империи. Устав о колониях иностранцев в империи 1857 г. Электронны рэсурс: http://www.rusdeutsch.ru/?hist=1&hmenu0=3&hmenu 01=16&hmenu 02=74 Дата доступу: 21.10.2019.

9. Филюта Н.М. Чешский и словацкий этносы в истории Беларуси (XIX – начало XXI в.) // Этнокультурное развитие Беларуси в XIX – начале XXI в.: мат-лы междунар. науч.-практ. конф. / редкол.: Т. А. Новогродский (отв. ред.) [и др.]. Минск, 2011. С. 219–223.

УДК 314.1 (476) (051) «1861/1914»

## СОЦИАЛЬНО-ДЕМОГРАФИЧЕСКОЕ ПОВЕДЕНИЕ НАСЕЛЕНИЯ БЕЛАРУСИ В УСЛОВИЯХ ТРАНСФОРМАЦИОННЫХ ИЗМЕНЕНИЙ (1861–1914 гг.)

***А.И. Сенько***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, senkoAI@bsu.by*

Данная статья посвящена вопросам формирования нового типа демографического поведения в условиях трансформации общества второй половины XIX – начала XX в. Закономерности изменения численного состава населения Беларуси, уровней его смертности и рождаемости связаны со вступлением белорусского общества в стадию демографического перехода, главным результатом которого является преобразование традиционного типа воспроизводства населения в современный. В статье рассматриваются социально-демографические процессы увеличения численности населения Беларуси, снижения смертности и рождаемости, эволюции брачно-семейных отношений, отражающие повышение уровня социально-экономического и культурного развития Беларуси в целом. Существенное внимание уделяется вопросу детской смертности как одному из основных демографических показателей.

***Ключевые слова:*** *демографическое поведение; численность населения; демографический переход; смертность; рождаемость.*

## САЦЫЯЛЬНА-ДЭМАГРАФІЧНЫЯ ПАВОДЗІНЫ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ ВА ЎМОВАХ ТРАНСФАРМАЦЫЙНЫХ ЗМЕН (1861–1914 гг.)

***А.І. Сенько***

*Беларускі дзяржаўны універсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, senkoAI@bsu.by*

Дадзены артыкул прысвечаны пытанням фарміравання новага тыпу дэмаграфічных паводзін насельніцтва ва ўмовах трансфармацыі грамадства ў другой палове XIX– пачатку XX ст. Заканамернасці змянення колькаснага складу насельніцтва Беларусі, ўзроўняў яго смяротнасці і нараджальнасці звязаны з уступленнем беларускага грамадства ў стадыю дэмаграфічнага пераходу, галоўным вынікам якога стаў пераход ад традыцыйнага тыпу ўзнаўлення насельніцтва да сучаснага. У артыкуле разглядаюцца сацыяльна-дэмаграфічныя працэсы павелічэння колькасці насельніцтва Беларусі, зніжэння смяротнасці і нараджальнасці, эвалюцыі шлюбна-сямейных зносін, якія адлюстроўваюць павелічэнне агульнага ўзроўню сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця Беларусі. Асаблівая ўвага надаецца пытанню дзіцячай смяротнасці як аднаму з галоўных дэмаграфічных паказальнікаў.

***Ключавыя словы:*** *дэмаграфічныя паводзіны; колькасць насельніцтва; дэмаграфічны пераход; смяротнасць; нараджальнасць.*

## SOCIO-DEMOGRAPHIC BEHAVIOUR OF POPULATION OF BELARUS IN CONDITIONS OF TRANSFORMATION (1861–1914)

***A. Senko***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus, senkoAI@bsu.by*

The article is devoted to issues of developing a new type of demographic behaviour of population of Belarus in conditions of transformation of society in the second half of the XX – the beginning of the XX century. The theory of the demographic transition, the main result of which is the transformation of the traditional type of population reproduction into the modern one, describes specifics of changes in the size of population, its death and birth rates. The article discusses the process of population growth in Belarus, reducing mortality and fertility rates, which pointed at the improvement of socio-economic and cultural development of Belarus, the transition to a new stage of its historical development in general. The author pays considerable attention to the issue of infant mortality as one of the main demographic indicators.

***Key words****: demographic behavior; population; demographic transition; mortality; birth rate.*